# СЕМАНТЫЧНЫ ЗМЕСТ КАНЦЭПТУ «ШЛЯХ» У МАСТАЦКІМ І ФІЛАСОФСКІМ ДЫСКУРСЕ

*А. Л. Сяліцкі,*
*БДПУ (Беларусь)*

У артыкуле разглядаецца семантыка канцэпту «шлях» як аб'екта мастацкай і філасофскай рэфлексіі. Адзначаецца, што канцэпт «шлях» фарміруе ў мастацкім і філасофскім дыскурсе семантычнае поле, якое рэпрэзентуе праблематыку анталагічнага, аксіялагічнага, маральнага характару. На падставе аналізу мастацкіх і філасофскіх твораў робіцца выснова пра ўніверсальны характар і семантычную паліфанію канцэпту «шлях», што дазваляе разглядаць яго як ідэацыйны канструкт агульнакультурнага ўзроўню.

*Ключавыя словы*: семантыка, канцэпт «шлях», мастацкі пейзаж, культуралогія, мастацкая культура, мастацкі дыскурс, філасофскі дыскурс.

Канцэпт «шлях» («дарога») з'яўляецца семантычным утварэннем, якое ўласціва як для мастацкай, так і для філасофскай рэфлексіі. Выступаючы адным з кампанентаў суперканцэпту «прастора», канцэпт «шлях» валодае пэўнай аўтаномнасцю, бо адлюстроўвае асноватворныя быційныя парадыгмы (напрыклад, жыццё – смерць,канчатковае – вечнае і інш.). Успрыняты першапачаткова як феномен фізічнай рэчаіснасці, шлях (дарога) з цягам часу стаў канцэптуальным вобразам для выражэння адносін унутранага і знешняга, чалавечага і прыроднага, рэальнага і звышрэальнага. Ужо ў міфалагічных сістэмах вобраз шляху (дарогі) выконваў важную ролю ў канструяванні агульнай карціны светабудовы. Л. С. Кажухоўская, звяртаючыся да семантыкі базісных сімвалаў беларускай міфапаэтычнай карціны свету, вызначае дарогу як «шлях праз міфічныя перашкоды», які «праходзіць праз поле – сімвал асабістага лёсу чалавека» [2, с. 57]. Такая трактоўка невыпадковая, бо ў дэнататным змесце канцэпту «шлях» закладзена значэнне вектару, напрамку руху, што заканамерна ўсталёўвае прычынна-выніковую сувязь паміж бінарнымі апазіцыямі. Гэта сцвярджае і С. Г. Дрыга, адзначаючы, што сэнсавая структура канцэпту «звязвае дзве супрацьлегласці – «сваё» і «чужое», абжытае і невядомае, бяспечную і небяспечную прастору <...>, а таксама рэалізуе апазіцыю жыццё – смерць» [1, с. 14].

У інтэрпрэтацыі семантычнага зместу канцэпту «шлях» істотным з'яўляецца яго тэмпаральны кампанент, які адлюстроўвае дыялектыку станаўлення, разгортванне падзей ці мыслення ў часе. Гэтым падкрэсліваецца каштоўнасць не толькі бінарных апазіцый як парадыгмальных установак, але і самога працэсу руху, змены формаў, пераходу з аднаго структурнага ўзроўню на іншы. У філасофскім эсэ І. У. Канчэўскага (І. Абдзіраловіча) «Адвечным шляхам» (1921) канцэпт «шлях» выступае ўвасабленнем быцця прыроды, якое разумеецца як перманентны працэс станаўлення новых формаў, як свайго роду «творчая эвалюцыя» (А. Бергсон). У такім аспекце «адвечны шлях» мае канатацыю ўніверсальнага закону, які аднолькава дзейнічае як у фізічным свеце, так і ў сацыяльнай практыцы.

Дынаміка станаўлення, якая закладзена у семантычным змесце канцэпту «шлях», у многім абумаўляе тое, што вобраз дарогі нярэдка выступае метафарай пазнання,



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

духоўнага росту, маральнага дасканалення. З асаблівай выразнасцю гэта праявілася ў традыцыйным мастацтве Кітая, у жанры «шань-шуй» («горы-воды»). У кітайскім мастацкім пейзажы дарога служыла сродкам рэпрэзентацыі быцця-шляху чалавека і прыроды ў касмічнай прасторы. Характэрна, што асноўная катэгорыя даасізму – «дао» – азначае менавіта «шлях». Дао выступае свайго роду матрыцай сусветных працэсаў, той найтанчэйшай структурай, што стварае аснову быцця. Мэтай чалавечага жыцця з'яўляецца спасціжэнне шляху-дао, праз што дасягаецца тоеснасць унутранага свету асобы з навакольным асяроддзем. У гэтым працэсе кітайскі традыцыйны пейзаж з'яўляўся і формай філасофскага сузірання, і шляхам да пранікнення ў схаваную сутнасць рэчаў. Вобраз дарогі злучаў усе ўзроўні быцця, выступаючы шляхам да духоўнага ўзвышэння, спасціжэння чалавекам сусветнай гармоніі.

Адзначаная маштабнасць семантычнага зместу канцэпту «шлях» надае яму функцыю мастацка-філасофскага канцэпту. Напрыклад, у эсэ М. Хайдэгера «Прасёлак» (1949) пейзажныя апісанні адлюстроўваюць не столькі карціну эстэтычнага перажывання і сузірання, колькі «метафізічны ландшафт», прастору чалавечай душы ў яе адкрытасці «паклічу быцця». Прасёлак выступае метафарай працэсу пазнання, шляхам да ісціны быцця, да вечнасці, да «светлай радасці ведання»: «Светлая радасць ведання квітнее ў паветры прасёлка, які змяняецца разам з порамі года, радасць ведання, што на першы погляд здаецца змрачнаватай. <...> На шляху, якім бяжыць прасёлак, сустракаюцца зімовая бура і дзень ураджаю, суседнічаюць абуджэнне вясны, якое бударажыць, і спакойнае ўміранне восені і бачныя адзін аднаму гульні дзяцінства і прымудроная старасць. Аднак у адзіным злітным сугуччы, рэха якога прасёлак нячутна і нема разносіць паўсюль, куды толькі заходзіць яго сцежка, усё далучаецца да радасці. Радасць ведання – брама, якая вядзе да вечнага» [6, с. 240]. Праз канцэптуальны вобраз «прасёлка» М. Хайдэгер выражае глыбінныя ўстаноўкі ўласнай філасофскай сістэмы, сцвярджаючы ідэю адзінства, «злітнага сугучча» быцця прыроды і чалавека.

Спецыфічным пластычна-сэнсавым варыянтам канцэпту «шлях» выступае матыў скрыжаваных дарог. Гэты вобраз узыходзіць да архетыпічнага сімвала крыжа і мае асноўнае значэнне «выбару». Асаблівую ролю ў перакрыжаванні адгрывае цэнтр, які выступае сэнсавым ядром розных тыпаў адносінаў. У большасці міфалагічных сістэм прысутнічалі ўяўленні пра наяўнасць пануючай кропкі светабудовы, свайго роду «пупа зямлі», адкуль разгортваецца ўся структура прасторава-часавага кантынуума. У. М. Тапароў, указваючы на ізафункцыянальнасць «пупа зямлі» іншым сімвалам цэнтра – Сусветнаму дрэву, Сусветнай гары, касмічнаму яйку, заўважае, што «пуп зямлі не толькі адзначае сакральны цэнтр Сусвету, але з'яўляецца ягонай апорай, нейкай сарцавінай і нават унутранай сутнасцю, якая сінтэзуе макракасмічны (касмалагічны) і мікракасмічны (чалавечы <...>) пачаткі» [5, с. 178]. Такім чынам, цэнтр перакрыжавання адлюстроўвае старажытную ідэю ізаморфнасці асобы і Сусвету, якая ў многім прадвызначыла семантыку значэнняў гэтага сімвала ў наступныя часы. Спецыфіка «чалавечай сітуацыі» абумоўлена знаходжаннем індывіда паміж духоўным і матэрыяльным светам, дабром і злом, быццём і небыццём, што робіць кропку перакрыжавання парадыгмальных анта-



РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

лагічных апазіцый у ментальнай прасторы ядром праблематыкі жыццёвага выбару. Своеасаблівую мастацкую інтэрпрэтацыю матыў скрыжаваных дарог атрымаў у трылогіі Я. Коласа «На ростанях» (1955), у якім ён набывае канцэптуальнае значэнне. Канцэпт «на ростанях» рэпрэзентуе ў творы сітуацыю экзістэнцыяльнага выбару, пошук адказу на адвечнае пытанне «быць ці не быць?». У шматгранным семантычным змесце мастацкага вобразу дарог, створаным у трылогіі Я. Коласам, увасобілася і імкненне людзей да «шукання іншых формаў», «лепшай долі», і жаданне выйсці за «нейкія граніцы», і «страшная бясконцасць блукання па свеце»: «Якая ж сіла заложана ў гэтых прасторах неабнімных родных шляхоў <...>? <...> можа, гэта таемная і страшная бясконцасць блукання па свеце, дзе трудна вызначыць пачатак і канец, сімваламі якіх з'яўляюцца гэтыя шляхі, авявае душу <...> невыразным хваляваннем і кліча яе зліцца з бяскрайнасцю зямлі? Ці то – няясны адбітак вечнага незадавальнення людскога, таемны покліч да шукання іншых формаў жыцця, несвядомае імкненне да лепшай долі? Ці то – парыванне душы разбіць нейкія граніцы і вырвацца на бязмежныя прасторы яшчэ нідзе неіснуючай волі?» [4, с. 73]. У прыведзеным урыўку «таемны покліч», што ідзе ад самой прыроды і рухае людзей да пошуку «іншых формаў жыцця», да самастанаўлення, на семантычным узроўні ў многім тоесны «поклічу быцця» ў філасофіі М. Хайдэгера, пачуць і прыслухацца да якога – актуальная задача для ўнутранага дасканалення чалавека, раптчыненага ў паўсядзённым існаванні («das Man»). Разам з тым, «вечнае незадавальненне людское», «парыванне душы» выйсці на новыя «бязмежныя прасторы» ўспрымаецца як метафара не толькі чалавечага, але і закладзенага у самой прыродзе крэатыўнага патэнцыялу, што карэлюе з поглядамі І. У. Канчэўскага на тое, што «ўсё існуючае творча» [3, с. 97]. Адзначаная філасафічнасць мастацкай інтэрпрэтацыі вобразу дарогі і «мастацкасць» ягонай філасофскай канцэптуалізацыі сведчаць пра ўніверсальны характар, семантычную паліфонію канцэпту «шлях», што робіць яго ідэацыйным канструктам агульнакультурнага ўзроўню.

Такім чынам, канцэпт «шлях» фарміруе ў мастацкім і філасофскім дыскурсе семантычнае поле, якое рэпрэзентуе праблематыку анталагічнага, аксіялагічнага, маральнага характару. Ядром гэтага поля выступае значэнне «шляху» («дарогі») як «руху», напрамак якога вызначае каштоўнасныя арыентацыі ў сістэме бінарных апазіцый. Пры гэтым сам працэс «руху» ў значэнні «станаўлення» можа набываць каштоўнаснае вымярэнне, выступаючы ўніверсальным законам развіцця прыроды, асобы і соцыуму.

**Літаратура**

1. Дрыга, С. Г. Концепт «путь» в русской языковой картине мира : автореф. дис. ... канд. филолог. наук : 10.02.01 / С. Г. Дрыга ; Кубан. гос. ун-т. – Ставрополь, 2010. – 23 с.
2. Кажухоўская, Л. С. Сімвалы гарманізацыі космасу беларусаў / Л. С. Кажухоўская // Искусство и культура. – 2014. – № 3(15). – С. 56–60.
3. Канчэўскі, І. Адвечным шляхам / І. Канчэўскі // Беларуская думка XX стагоддзя = Myśl białoruska XX wieku : Філасофія, рэлігія, культура : анталогія / уклад., прадм., апрц. Ю. Гарбінскага. – Варшава : ІС ПАН, 1998. – С. 73–101.
4. Колас, Якуб. На ростанях : трылогія / Якуб Колас. – Мінск : Дзярж. вучэбна-педагагічнае выд-ва М-ва асветы БССР, 1958. – 697 с.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

5. Топоров, В. Н. Пуп земли / В. Н. Топоров // Мифология : Статьи для мифологических энциклопедий : в 2 т. – М. : Языки славянской культуры : Знак, 2014. – Т. 2. – С. 178–184.
6. Хайдеггер, М. Просёлок / М. Хайдеггер // Работы и размышления разных лет. – М. : Гнозис, 1993. – С. 238–241.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ